# Купала ў анлайне

Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ) стартаваў праект "Светач беларускай паэзіі", прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

У рамках літаратурна-мастацкага праекта адбылася прэзентацыя факсімільнага выдання паэтычнага зборніка Янкі Купалы "Шляхам жыцця" і віртуальнага праекта "Янка Купала і Якуб Колас".

— Моладзь зараз любіць чытаць не столькі з паперы, колькі з электронных носьбітаў, — распавядае Раман Матульскі, дырэктар НББ. — Якраз на такое кола чытачоў разлічаны электронны інфармацыйны рэсурс, фундамент якога ўжо гатовы. Гэты рэсурс будзе ўсім даступны ў інтэрнэце і прысвечаны нашым класікам — Янку Купалу і Якубу Коласу. Там плануецца змясціць абсалютна ўсе творы пісьменнікаў, уключаючы крытыку і ўспаміны. На працягу 2012 года мы збіраемся гэты рэсурс папаўняць.

Таксама ў рамках праекта "Светач беларускай паэзіі" адкрылася юбілейная кніжна-ілюстрацыйная выстава "Пясняр беларускай душы". На ёй прадстаўлены самыя першыя выданні твораў Янкі Купалы, датаваныя 1920—1930-мі гадамі.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**